# ПРАВЯДЗЕННЕ НАВУКОВАГА ХАКАТОНА Ў СІСТЭМЕ ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

**Л. Г. Дуктава**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*duktova.liubou7@gmail.com*

У цяперашні час у свеце існуе шэраг вядомых міжнародных навуковых праектаў, накіраваных на кансалідацыю навукоўцаў і прасоўванне іх ідэй. Навуковы хакатон «Беларусь, Расія, Кітай: брэнды, медыярылейшнз, культурныя коды», які мае дастаткова высокі патэнцыял, які забяспечвае далейшае развіццё экспарту адукацыйных паслуг. Правядзенне навуковага хакатона скіравана на фарміраванне рэпутацыйнага капіталу для ўстаноў вышэйшай адукацыі, фарміруе цікавасць да спецыяльнасцей, сведчыць аб практыкаарыентаваным падыходзе ў навучанні, з'яўляецца інавацыйным падыходам пры нарошчванні экспартнага патэнцыялу ў сферы адукацыйных паслуг.

***Ключевые слова***: навуковы хакатон; тэхналогіі камунікацыі; прафарыентацыйная работа; культурны код; медыярылейшнз; брэнд.

# CONDUCT OF A SCIENTIFIC HACKATHON IN THE SYSTEM OF PROFESSIONAL WORK

**L. G. Duktava**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: L.G. Duktava (duktova.liubou7@gmail.com)*

Currently, there are a number of well-known international scientific projects in the world aimed at consolidating scientists and promoting their ideas. Scientific hackathon «Belarus, Russia, China: brands, media relations, cultural codes», which has a sufficiently high potential that ensures further development of the export of educational services. Conducting a scientific hackathon is aimed at building reputational capital for higher education institutions, creates interest in specialties, demonStrates a practice-oriented approach to education, and is an innovative approach to building export potential in the field of educational services.

***Key words:*** scientific hackathon; communication technologies; career guidance work; cultural code; media relations; brand.

Рэалізацыя адукацыйных праграм для магістратуры ў Рэспубліцы Беларусь накіравана на фарміраванне прафесійных кампетэнцый у адпаведнасці з выбранай спецыяльнасцю і набыццём навыкаў навукова-даследчай дзейнасці. Арганізацыя навукова-папулярных мерапрыемстваў з удзелам магістрантаў спрыяе практычнай скіраванасці навучання, дазвале пазанёміць са спецыяльнасцю шырокае кола грамадства.

Кафедра тэхналогій камунікацыі і сувязей з грамадскасцю БДУ з'яўляецца выпускаючай для студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «Камунікацыі». З 2020 года па адукацыйных праграмах магістратуры па дадзенай спецыяльнасці сталі навучацца замежныя грамадзяне – прадстаўнікі Кітайскай Народнай Рэспублікі, Рэспублікі Эквадор. Назіраецца штогадовы рост колькасці замежных магістрантаў па дадзенай спецыяльнасці ў 2 разы. Адной з задач кафедры з'яўляецца ажыццяўленне якаснага практыкаарыентаванага навучання. Да асноўных практыкаарыентаваных праектаў, якія ажыццяўляюцца кафедрай тэхналогій камунікацыі і сувязей з грамадскасцю БДУ, адносяцца «Акадэмія камунікацыі» (праект з 2007 года ажыццяўляецца студэнтамі III курса спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя», накіраваны на разбор дзеючых кейсаў у сферы рэкламы і PR у беларускай і замежнай. практыцы) і інш. Да мерапрыемстваў кафедры для замежных магістрантаў адносіцца навуковы хакатон «Беларусь, Расія, Кітай: брэнды, медыярылейшнз, культурныя коды», які мае дастаткова высокі патэнцыял, які забяспечвае далейшае развіццё экспарту адукацыйных паслуг.

У 2021 годзе стартаваў першы сезон навуковага хакатона «Беларусь і Кітай: брэнды, медыярылейшнз, культурныя коды», у якім прынялі ўдзел 40 студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі (магістрантаў) спецыяльнасці 1-23 80 11 «Камунікацыя» профілю «Дзяржаўныя і карпаратыўныя камунікацыі». БДУ. Конкурс праводзіўся па дзвюх катэгорыях: «Лепшая прэзентацыя навуковага даследавання», «Лепшае пытанне для маладога вучонага». У 2023 годзе колькасць удзельнікаў значна вырасла, як и сама праграма мерапрыемства. На працягу трох дзён былі падведзены вынікі конкурса відэаролікаў, прэзентуючых навуковыя дасягненні маладых навукоўцаў-камунікатараў, адбылася серыя майста-класаў, прайшла сустрэча ўдзельнікаў навуковага хакатона са спецыялістамі па сувязі з грамадсткасцю беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

Тэмы навуковых даследаванняў, якія прэзентавалі магістранты ў ходзе правядзення першага сезона навуковага хакатона, датычыліся як інструментаў фарміравання брэндаў Беларусі, Кітая, так і выяўлення

культурных кодаў пры прасоўванні тавараў і паслуг у міжкультурнай камунікацыі з выкарыстаннем інструментаў медыярылейшнз.

У цэлым, У цяперашні час у свеце існуе шэраг вядомых міжнародных навуковых праектаў, накіраваных на кансалідацыю навукоўцаў і прасоўванне іх ідэй: «TED», «Science Slam», «International Fame Lab», «Курылка Гутэнберга», «Чайнік Расэла», «Навука па-за сябе» і інш. У названых міжнародных праектах акцэнт робіцца на папулярызацыю навуковых ідэй, але не на іх магчымую камерцыялізацыю. Акрамя таго, шырокае кола ўдзельнікаў не дае магчымасці забяспечыць перавагі дзяржаўнай сістэме адукацыі краін-удзельнікаў і павялічыць экспарт адукацыйных паслуг. Міжнародны статус навуковага хакатона садзейнічае не толькі кансалідацыі прадстаўнікоў навуковай супольнасці універсітэтаў розных краін, але і дае магчымасць аптымізаваць работу з мэтавымі аўдыторыямі пры прасоўванні інавацыйнага прадукту на рынкі іншых дзяржаў з улікам культурных кодаў, з якімі працуюць камунікатары.

Такім чынам, правядзенне навуковага хакатона скіравана на фарміраванне рэпутацыйнага капіталу для ўстаноў вышэйшай адукацыі, фарміруе цікавасць да спецыяльнасцей, сведчыць аб практыкаарыентаваным падыходзе ў навучанні, з’яўляецца інавацыйным падыходам пры правядзенні прафарыентацыйнай работы з замежнымі абітурыетамі, нарошчванні экспартнага патэнцыялу ў сферы адукацыйных паслуг.